# УЖЫВАННЕ ПОЎНЫХ І КАРОТКІХ ПРЫМЕТНІКАЎ, ФОРМ СТУПЕНЕЙ ПАРАЎНАННЯ ЯКАСНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ (10 КЛАС)

**Машканава Святлана Аляксандраўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА "Суражская сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова"

***Родная мова – крыніца ведаў і натхнення!***

*Дадзены ўрок праводзіцца пасля паўтарэння тэмы "Ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў". На ім вучні сістэматызуюць атрыманыя веды па тэме. Падабраныя заданні спрыяюць паўтарэнню тэарэтычнага матэрыялу і прымяненню практычных навыкаў па тэме.*

**Тэма:** ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў.

**Мэта:** да заканчэння ўрока вучні сістэматызуюць веды па асноўных пытаннях тэмы " Прыметнік".

**Тып урока:** абагульненне і сістэматызацыя ведаў.

**Прымяненне тэхналогій:** элементы крытычнага мыслення.

**Формы работы:** індывідуальная; работа ў пары.

**Прыём:** мазаіка ( на дошцы змяшчаецца мазаіка, трэба скласці яе так, каб даведацца, як гучыць тэма).

**Падручнік:** Беларуская мова (2020 год).

**Задачы:**

– садзейнічаць сістэматызацыі і абагульненню ведаў па тэме "Ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў";

– спрыяць удасканальванню навыкаў утварэння форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў, вызначэнню сінтаксічнай функцыі поўных і кароткіх прыметнікаў;

– садзейнічаць выхаванню павагі да роднай мовы.

**Этапы ўрока:**

***І. Арганізацыйна-матывацыйны***

– З якім настроем вы сёння прыйшлі на ўрок? За акном цудоўнае надвор'е і гэта дае мне магчымасць спадзявацца, што дзень будзе па-сапраўднаму добрым, а наша праца – захапляючай і плённай.

Мы паўтарылі тэму "Прыметнік". Можа, каму-небудзь з вас яна здалася сумнай і нецікавай, але ж ведаць, як правільна ўжываць прыметнікі ў мове, трэба кожнаму. Давайце вызначым задачы нашага ўрока.

(На дошцы напісана: Будзем ведаць… Будзем умець…)

***ІІ. Актуалізацыя ведаў***

*1). Праверка тэарэтычных ведаў*

Лічбавы дыктант. (0 – не згодзен (не згодна), 1 – згодзен (згодна)

1. Якасныя прыметнікі абазначаюць прыметы прадметаў паводле формы, памеру, колеру, фізічных і душэўных уласцівасцей ці якасцей. (1)

2. Адносныя прыметнікі абазначаюць прыметы прадметаў паводле іх прыналежнасці чалавеку або жывёлам, птушкам. (0)

3. Прыналежныя прыметнікі абазначаюць прыметы прадметаў паводле іх адносін да матэрыялу ці рэчыва, месца, часу. (0)

4. Поўная форма прыметніка ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду мае канчатак -ы, -і: прыгожы, невысокі. (1)

5. Кароткая форма прыметніка ў Н. скл., адз. л., м.р. мае нулявы канчатак: сябар рад, дзед невысок. (1)

6. У сказе поўныя прыметнікі выконваюць ролю азначэння ці выказніка. (1)

7. У сказе кароткія прыметнікі выконваюць ролю толькі азначэння. (0)


Арфаграфічная
хвілінка


Будзем ведаць…
Будзем умець…


Дзявятага сакавіка
Класная работа
ступеней параўнання
якасных прыметнікаў

8. Якасныя прыметнікі маюць дзве ступені параўнання: вышэйшую і найвышэйшую.(1)

9. Не ўтвараюць ступеней параўнання якасныя прыметнікі, якія абазначаюць масці жывёл ( буры, пярэсты).(1)

*2). Праверка практычных навыкаў*

1. Утварыце ступені параўнання прыметнікаў (картка)

Моцны – мацнейшы, больш моцны, наймацнейшы, самы моцны.

Дарагі – даражэйшы, больш дарагі, найдаражэйшы, самы дарагі.

2. Практыкавнне 265. Знайдзіце формы ступеней параўнання якасных прыметнікаў, утвораныя з адступленнем ад граматычнай нормы.

1) Зямля, ты стала для мяне раднейшай і даражэйшай.

2) І гор няма ў нас аніякіх, ды людзі ёсць – вышэйшыя ад гор.

4) Мне доўгае расстанне з Вамі чарнейшае ад Вашых чорных кос.

6) Мне неба тваё больш  яснае, радзіма мая дарагая.

8) Людское сэрца адчуваць, каб зрухі самыя тонкія сваёй душой расшыфраваць.

***III. Дынамічная паўза***

1. Лінгвістычная гульня “Сонейка”

Вышэйшая ступень параўнання прыметніка

Найвышэйшая ступень параўнання прыметніка





Вучні па ланцужку падыходзяць да дошкі, прымацоўваюць промні да сонейка з прыметнікамі вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання: мацнейшы, наймацнейшы, больш моцны, найбольш моцны, святлейшы, найсвятлейшы, менш светлы, найменш светлы, самы лепшы, найлепшы, прыгажэйшы, найпрыгажэйшы.

2. Арфаграфічная хвілінка

– Выпраўце памылкі ў сказах (на дошцы).

• Дарога стала больш вузкаватая. (Больш вузкая.)

• Маліны больш саладзейшыя за клубніцы. (Больш салодкія.)

• Вавёркіных запасаў хопіць на ўсю зіму. (Вавёрчыных.)

• Недалёка ад лесу – дзядзькіна хата. (Дзядзькава.)

3. Утварыце і запішыце формы ступеней параўнання прыметніка чысты (картка).

***IV. Кантрольна-рэфлексійны***

Выкананне тэставых заданняў

1. Што абазначае прыметнік?

А) прымету дзеяння

Б) дзеянне прадмета

В) прымету прадмета

2. Адзначце кароткія формы прыметніка:

А) вячэра гатова

Б) снеданне гатова

В) абед гатовы

3. Адзначце прыметнік у форме вышэйшай ступені параўнання:

А) прыгажэйшы

Б) найбялейшы

В) глыбокі

4. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі:

А) гарадская вуліца, школьны двор

Б) глыбокая рака, кіслы яблык

В) лісіная нара, сястрын дом

5. Адзначце няправільна ўтвораныя прыналежныя прыметнікі:

А) Васіны канькі

Б) у дзядуліным садзе

В) ластаўчына гняздо

6. Адзначце прыметнікі, у якіх пішацца -нн- :

А) драўля…ы, ветра…ы

Б) будзё…ы, абедзе…ы

В) імя…ы, вогне…ы

7. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца праз злучок:

А) (жоўта) цьмяны

Б) (навукова) даследчы

В) (сто) гадовы

8. Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:

А) французскі, нясвіжскі

Б) палесскі, таварышскі

В) конскі, любанскі

9. Адзначце прыметнікі, з якімі не (ня) пішацца разам:

А) (не)абходны, (не)ахайны

Б) (не)гарачы, а халодны

В) (не)глыбокі, (не)высокі

Правільныя адказы:

1 В, 2 АБ, 3 А, 4 Б, 5 АБ, 6 БВ, 7 АБ, 8 АВ, 9 АВ

Прадоўжыце фразу “ Я паставіла б ( паставіў бы) сабе за ўрок …, таму што…

***V. Дамашняе заданне.*** Напішыце міні-сачыненне  пра сваю любімую пару года, ужывайце формы ступеней параўнання прыметнікаў.